ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЧАЦВЕР
10
КАСТРЫЧНІКА
№ 23(1687)

## ЧЫРВОНЫ РАДОК

Чарговае малое навукова-тэхнічнае прадпрыемства нарадзілася ва універсітэце. На гэты раз — пры кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі механіка-матэматычнага факультэта. Яго назва — «НІЦНТ», дырэктарам прызначаны прафесар Валерый Паўлавіч КАЗЛОЎ.

* * *

Геаграфія замежных паездак выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ працягвае пашырацца разам з павелічэннем іх колькасці. Толькі некалькі з апошніх прыкладаў. Шэсць месяцаў будзе працягвацца навуковая стажыроўка ў Канадзе загадчыка лабараторыяй фізікі электронных матэрыялаў аддзела фізікі пераўтварэння інфармацыі фізічнага факультэта У. А. Самуйлава. У Югаславію адбыў дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі мацярыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі І. П. Галай — для навуковай работы па міжвузаўскаму супрацоўніцтву. А Д. А. Вайтовіч, асістэнт кафедры агульнай фізікі фізічнага факультэта, будзе знаходзіцца на працягу трох месяцаў у Бразіліі. Ён атрымаў запрашэнне фізічнага факультэта каталіцкага універсітэта г. Рыа-дэ-Жанейра.

* * *

Вітаем новага госця універсітэта! На працягу месяца будзе займацца навуковай работай у БДУ прафесар універсітэта Вюрцбург, што ў Германіі, доктар прыродазнаўчых навук Апель Юрген. Выступіць у ролі самых гасцінных гаспадароў давядзецца прадстаўнікам механіка-матэматычнага факультэта.

## ДАЗВОЛЬЦЕ ПРАДСТАВІЦЬ!

# Новае назначэнне

*Вадзіма Мікалаевіча ЦЯСЛЕНКІ для кагосьці, магчыма, прайшло незаўважным. Бо адбылося ў час летніх адпачынкаў.*

*Да вашай увагі — першае яго інтэрв'ю на пасадзе начальніка аддзела кадраў «Беларускаму універсітэту».*

**— Такім чынам, Вадзім Мікалаевіч, пра сябе...**

— Нарадзіўся ў 1936 годзе. Жанаты. Сын. Нявестка. Унучка. Закончыў вайсковае вучылішча. Праслужыў у войску 33 гады. Універсітэцкую біяграфію пачаў з пасады начальніка вучэбнга аддзела. Праз чатыры з паловай гады атрымаў прапанову памянць яго на аддзел кадраў.

**— Якім чынам змена кабінетаў і новы запіс у працоўнай кніжцы паўплывалі на Ваш працоўны распарадак?**

— Перш за ўсё, павялічыўся аб'ём работы. У вучэбным аддзеле амаль уся яна планавая і выконваецца больш арганізавана, па чарзе. Тут — многа цякучкі. Не падрыхтуеш загадзя дакументы на залічэнне абітурыентаў, не заплануеш пераводы студэнтаў з аднаго курса на другі, адлічэнні, аднаўленні, звальненні...

**— Што Вы прынеслі з сабой на новае месца работы?**

— Вострае жаданне больш-менш раўнамерна размеркаваць абавязкі паміж супрацоўнікамі аддзела. Каб кожны рабіў у тэрмін свой аб'ём работы, а ўсе разам працавалі зладжана. А таксама цвёрдую ўпэўненасць у тым, што паператворчасць павінна страціць сваё спрадвечнае значэнне і быць аўтаматызаванай.

Праз тыдзень-два з дапамогай ЭВМ будзе апрацоўвацца дакументацыя на прафесарска-выкладчыцкі састаў,потым — на ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў. Гэта дазволіць нам у прамым сэнсе эканоміць і грошы, і час.

**— І скараціць, пэўна, на некалькі гадзін Ваш працоўны дзень?**

— Што датычыць часу, то яго, я ўпэўнены, усё роўна не будзе хапаць... Тыя, хто ўяўляе сабе, што начальнік і ўсе супрацоўнікі аддзела кадраў працуюць толькі з паперамі, памыляюцца. У творчым плане — гэта работа па вывучэнню таго кантынгенту людзей, якія працуюць ва універсітэце. І калі для асноўнага вызваліцца час, памылак у падборы кадраў будзе менш.

**— Прабачце за наступнае пытанне. Якія непрыемнасці чакаюць Вас кожную раніцу за дзвярыма кабінета начальніка аддзела кадраў?**

— Раней у маім кабінеце ніхто не плакаў, не лаяўся, не пагражаў. Цяпер такое здараецца.

Ніколі не сарвацца ў адказ — гэта мая звычка, выпрацаваная яшчэ ў гады работы начальнікам курса ў вайсковым вучылішчы. І чарга ля маіх дзвярэй збіраецца часам толькі таму, што нікому ў прыёме не адмаўляю.

# СТЫПЕНДЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Кожны студэнт валодае правам на стыпендыю, якое не залежыць ад яго матэрыяльнага становішча, полу, расы, нацыянальнай прыналежнасці, веравызначэння і сацыяльнага становішча.

З 1 мая 1991 года ўведзены новыя памеры дзяржаўных стыпендый з уключэннем у іх прадугледжаных да выплат сум, якія звязаны з індэксацыяй даходаў насельніцтва, зыходзячы з росту цэн за студзень-сакавік 1991 г. на 15,3 працэнта.

У вышэйшых навучальных установах паспяваючым студэнтам у памеры 129 рублёў у месяц, у тым ліку тым, хто мае толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі,— 146 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 164 рублі ў месяц;

студэнтам з ліку дзяцей-сірат і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў,— у памеры 172 рублі ў месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі,— 200 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 228 рублёў у месяц;

студэнтам з ліку дзяцей-сірат і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у памеры 106 рублёў у месяц, а калі яны маюць добрыя ці добрыя і выдатныя адзнакі,— 123 рублі, толькі выдатныя адзнакі — 139 рублёў у месяц;

— студэнтам, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з рашэннем урада на поўным дзяржаўным забеспячэнні, у памеры 53 рублі ў месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя і выдатныя адзнакі,— 69 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 85 рублёў у месяц;

\- студэнтам з ліку воінаў-інтэрнацыяналістаў у памеры 160 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі,— 175 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 190 рублёў у месяц. А тым з іх, хто знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, адпаведна — 100, 110 і 120 рублёў у месяц;

студэнтам з ліку былых ваеннаслужачых, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, знявечання ці захворвання, атрыманага пры выкананні інтэрнацыянальнага доўга, у памеры 195 рублёў у месяц, 214, 233 рублі ў месяц. Інвалідам, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, адпаведна 120. 135 і 150 рублёў у месяц;

студэнтам, Героям Савецкага Саюза і Героям Сацыялістычнай Працы адпаведна ў памеры 225, 254, 283 рублі ў месяц;

студэнтам за асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці можа ўстанаўлівацца персанальная стыпендыя Савета ВНУ у памеры 185 рублёў у месяц (Белдзяржуніверсітэту — 7 стыпендый).

ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ:

імя У. І. Леніна і К. Маркса ў ВНУ — 230 рублёў у месяц;

імя вядомых дзеячаў навукі, тэхнікі і культуры, па рашэннях урадаў Рэспублікі Беларусь і СССР — 220 рублёў у месяц.

Студэнтам, якія праходзяць ваенную падрыхтоўку ў ВНУ па праграме афіцэраў запасу, надбаўкі да ўстаноўленых стыпендый вызначаюцца зыходзячы з памераў стыпендый, зацверджаных пастановай Савета Міністраў БССР ад 17 мая 1990 года № 24.

Глуханямым і сляпым студэнтам ВНУ выплочваецца да ўстаноўленай стыпендыі надбаўка ў памеры 50 працэнтаў.

Дзяржаўныя прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, якія заключылі індывідуальныя дагаворы, выплочваюць за кошт сваіх сродкаў студэнтам, якія паспяваюць, стыпендыю, павышаную не менш чым на 30 працэнтаў; пры працоўным стажы больш за 3 гады — не менш чым на 50 працэнтаў у параўнанні з памерамі дзяржаўных стыпендый, устаноўленых для адпаведных спецыяльнасцей вучэбных установ.

Выплочваць студэнтам вышэйшых навучальных установ, якія знаходзяцца ў акадэмічным адпачынку па медыцынскіх паказчыках, дапамогу ў памеры 50 рублёў у месяц на перыяд акадэмічнага адпачынку за кошт сродкаў вучэбнай установы.

Стыпендыі замежным грамадзянам, якія навучаюцца ў вышэйшых навучальных установах і атрымліваюць стыпендыю за кошт савецкага боку, павялічваюцца зыходзячы з індэкса росту цэн на 15,3 працэнта.

## ЗВАНОК З РЭДАКЦЫІ

*Нядаўна «Народная газета» паведаміла, што сем выкладчыкаў артылерыйскіх дысцыплін ваеннай кафедры БДУ на чале з начальнікам цыкла палкоўнікам А. М. Гальперыным зрабілі заяву аб жаданні прысвяціць сябе справе стварэння Беларускага войска. Заяву падтрымалі таксама 96 працэнтаў студэнтаў, якія займаюцца на гэтым цыкле.*

*Подпісу начальніка кафедры палкоўніка Ю. І. БАЛЬШАКОВА там няма. Ці падтрымлівае ён ідэю, выказаную ў заяве?*

# Хто «за», хто «супраць»?

У тэлефоннай размове Юрый Ільіч паведаміў рэдакцыі, што ваенная кафедра будзе рыхтаваць афіцэраў запасу для Беларускага войска, калі яно з'явіцца. Начальнік кафедры ўпэўнены ў рэальнасці такой падзеі, хаця, на яго думку, пасля фарміравання нацыянальнай арміі і нацыянальнай гвардыі частка войска па-ранейшаму будзе падначалена цэнтру.

Ваенная кафедра БДУ, як лічыць яе начальнік, ужо сёння можа рыхтаваць кадры для нацыянальнай арміі, бо для іх няма неабходнасці мяняць вучэбныя планы.

## АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

# Канец аперацыі «Бульба»

Першае пытанне, якое ўзнікае ў кожнага, хто знаёмы са спецыфікай студэнцкай працы: «А ці трэба наогул пасылаць на палеткі студэнтаў?» Справа не ў тым, што студэнты працуюць дрэнна. Наадварот. Ці карысна з эканамічнага пункту гледжання працаваць па-чорнаму, каб не атрымаць потым амаль нічога, а то і застацца даўжніком? Прэцэдэнты ёсць. Немалыя, здаецца, грошы пасля ўсіх адлічэнняў ператвараюцца ў такую суму, што і казаць каму смешна. Цана на бульбу ўзнялася, у Мінску мех ідзе за 90 рублёў, а тыя, хто працаваў цэлы месяц, узнагароджаны... пяцірублёўкай. Выходзіць, працавалі задарма?

Вельмі добра запалі ў памяць словы старшыні калгаса, калі ён заклікаў усіх да ўдарнай працы. Але, як вядома, добра працаваць можна тады, калі ўсе астатнія службы функцыяніруюць безадказна. Са дня ў дзень паўтаралася карціна — да пачатку рабочага дня пад'язджае адзін бульбазборачны камбайн, толькі праз гадзіну-паўтары — яшчэ адзін. Пасля абеду, можа, і будзе трэці. А можа і не... На адным к[illegible]байне працуюць толькі 4 чалавекі, а астатні[illegible]мушаны збіраць за камбайнам бульбу памера[illegible]тарох. Бывае, што з-за непадрыхтаванасці ка[illegible]кaў праца зусім стаіць. У апошнія дні, здара[illegible] на полі не было ні камбайнаў, ні бульбы. [illegible]кі мясцовае насельніцтва напужана паглядал[illegible]ючыся, мабыць, што ўзрушаныя студэнты кіну[illegible] збіраць бульбу з іх радкоў.

Усё[illegible]а што сказана вышэй,— нашы памылкі. Як па[illegible]егнуць іх у наступным годзе? Пры заключэнні дагавораў больш падрабязна разглядаць умовы працы і аплаты, знаёміць з імі ўсіх студэнтаў. Хацелася б спадзявацца, што ў будучым адносіны калгасаў да гэтых пытанняў будуць больш сур'ёзныя, менавіта тады ў выйгрышу апынуцца ўсе.

А. АРШАНСКІ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ПАЛІТЫЧНЫ КЛУБ

# АДПБ у сістэме дэмакратычных сіл

Адносіны людзей да працэсаў, што адбываюцца ў рэспубліцы, неадназначныя. Погляды, перакананні, інтарэсы, настрой па некаторых пытаннях часам вельмі розныя, чым абумоўлена і розніца ў праграмах і дзеяннях дэмакратычных сіл: нацыянальна-дэмакратычнага, сацыял-дэмакратычнага, і ліберальна-дэмакратычнага руху. Дробязныя адрозненні не павінны стаць перашкодай для іх аб'яднання ва ўмовах вострага супрацьстаяння таталітарных, пракамуністычных сіл і сіл свабоды, дэмакратыі. І ўсё ж кожны напрамак мае асабісты ўчастак жніва на агульнай дэмакратычнай ніве.

Аб'яднаная Дэмакратычная партыя Беларусі (АДПБ) — партыя ліберальна-дэмакратычнага напрамку. І з боку крайне правых, і з боку крайне левых нярэдка гучыць крытыка ў яе адрас.

Канчатковай мэтай АДПБ з'яўляецца стварэнне такой формы дзяржаўнасці, якая забяспечыла б эканамічную незалежнасць асобы.

Таталітарызм у любой яго форме прыгнятае асобу. Эканоміка ў таталітарнай дзяржаве цалкам падпарадкавана дзяржаўным структурам, а без эканамічнай незалежнасці асобы не можа быць сапраўднай яе свабоды. Свабода чалавека — фікцыя, калі ў яго няма ўласнасці. Таму тыя, хто выступае за дамініраванне дзяржаўнай уласнасці, свядома ці несвядома імкнуцца закабаліць чалавека, падпарадкаваць яго дзяржаўным структурам, за якімі ў рэспубліцы стаіць наменклатура, бюракратыя як такавая.

Усё гэта дастаткова дакладна ўяўляе сабе АДПБ. Таму яе галоўны лозунг — свабода асобы. Сэнс свайго ўзнікнення і існавання (партыя зарэгістравана 19 сакавіка 1991 года) яна бачыць у тым, каб пераўтварыць грамадскія адносіны і стварыць умовы для эканамічнай і сацыяльнай незалежнасці асобы, устойлівага росту яе матэрыяльнага дабрабыту і духоўнай культуры. Зразумела, абсалютнай свабоды асобы ў грамадстве няма ў быць не можа. Але ў даным выпадку размова аб тым, што першасным для АДПБ (не на словах, а на справе) з'яўляецца чалавек, яго праблемы, інтарэсы, мэты.

Разам з тым мы добра ўсведамляем, што выхад з сённяшняй сітуацыі магчымы толькі праз адраджэнне беларускага народа, праз сапраўдны суверэнітэт Беларусі.

Ідэолагі КПБ не разумеюць (больш верагодна, робяць выгляд, што не разумеюць), што марксісцкая інтэрпрэтацыя сутнасці капіталізму і сацыялізму ўжо не адпавядае рэаліям канца XX стагоддзя. Яшчэ за больш чым сто гадоў пайшло далёка наперад. Няма таго капіталізму, які быў у часы Маркса ці Леніна. Нельга назваць сацыялістычным і грамадства, у якім жывём мы.

Сацыялізм — гэта самакіраванне вытворцаў. Ці можна сказаць, што гэта мае месца ў нас? Краіны, якія завуцца цяпер цывілізаванымі, значна бліжэй да сацыялізму ў такім яго разуменні. Дзяленне дзяржаў на капіталістычныя і сацыялістычныя яўна састарэла. Зараз больш правільна гаварыць аб краінах з натуральнай, рыначнай эканомікай і краінах з анамальнай, ідэалагізаванай эканомікай.

АДПБ выступае за некамуністычны шлях развіцця, за дзяржаўнасць з натуральнай эканомікай. За во-



клічамі аб выратаванні сацыялізму бачыцца, папершае, тэарэтычная непісьменнасць, па-другое, імкненне захаваць існуючую форму ўласнасці, уладу, прывілеі тым, хто цяпер усім гэтым валодае. Ні ў які камунізм наша бюракратыя не верыць, а словы «сацыялізм», «капіталізм» і т. п.— проста сцягі ў барацьбе за ўласнасць і ўладу. Народ гэта цудоўна разумее, таму КПБ, як партыя, будучыні не мае. Яе лідэры ў сітуацыі, якая склалася, спрабуюць замяніць шыльду партыі, захаваўшы яе сутнасць. А сутнасцю сённяшняй КПБ з'яўляецца захаванне сваёй (ці такой, ці яе пагляд) уласнасці.

Уласнасць — усё тое асноўнае, вакол чаго круціцца і будзе круціцца палітыка, у якое б адзенне яна ні прыбіралася, якімі б словамі ні прыкрывалася. Хацелася б звярнуць увагу, што прыватызацыя, як яна некаторымі функцыянерамі ўяўляецца і пачынае практычна ажыццяўляцца, небяспечная цяжкімі вынікамі для грамадства. Калі людзі зразумеюць, што іх у чарговы раз бязлітасна падманулі, яны не ўтаймуюцца.

АДПБ выступае за роўныя стартавыя магчымасці пры ажыццяўленні прыватызацыі і пераходзе да рынку. Далей няхай выяўляюцца здольнасці людзей у галіне прадпрымальніцтва, эканамічнай і гаспадарчай творчасці, арганізацыі вытворчасці і г. д., няхай выяўляюцца іх смеласць і ініцыятыва, але на пачатку ўсе павінны быць роўныя. У гэтым дэмакраты, трэба спадзявацца, займаюць адзіныя пазіцыі.

Два фактары, якія будуць садзейнічаць выхаду Рэспублікі з крызіснага стану: асабістая зацікаўленасць чалавека і рост самасвядомасці народаў Беларусі. Узнікненне, разам з існуючай дзяржаўнай, іншых форм уласнасці абумоўвацць з'яўленне эканамічнага прыватнага інтарэса і, такім чынам, ініцыятывы, прадпрымальнасці, энергіі думкі і дзеяння. Рост самасвядомасці народаў, што жывуць на тэрыторыі Рэспублікі, будзе спалучацца з умацаваннем пачуцця асабістай важнасці і годнасці чалавека любой нацыянальнасці, што ў канчатковым выніку будзе садзейнічаць прагрэсу беларускай дзяржавы.

Разам з тым мы выступаем супраць сілавых прыёмаў у практычнай рэалізацыі адраджэння народаў Беларусі. Паспешнасць, забяганне наперад, імкненне выдаваць жаданае за сапраўднае можа прывесці да прама супрацьлеглых вынікаў і апынецца зручкі таталітарным, пракамуністычным сілам. АДПБ наогул супраць любога насілля над асобай, якімі б добрымі намерамі гэта ні апраўдвалася.

Кожны вольны ў выбары мовы зносін. Задача бачыцца ў тым, каб стварыць умовы, пры якіх бы чалавек асэнсаваў неабходнасць ведання дзяржаўнай мовы, каб у яго узнікла патрэба і ён меў магчымасць для яе вывучэння. Рашаючую ролю адыграюць тут не дэкларацыі, пастановы і ўказы, а развіццё нацыянальнай культуры, літаратуры і мастацтва.

І, нарэшце, некалькі слоў аб прэзідэнцкай форме праўлення ў Рэспубліцы.

Неабходнасць яе ўвядзення пры існуючай расстаноўцы палітычных сіл вельмі праблематычная. Аднак калі Вярхоўны Савет прыме рашэнне аб правядзенні выбараў прэзідэнта, дэмакратычныя сілы павінны вылучыць адзінага кандыдата. Ім, на маю думку, можа стаць чалавек, добра вядомы народу, той, хто карыстаецца яго даверам і свабодна валодае роднай беларускай мовай.

І. МАРОЗАЎ,
кандыдат філасофскіх навук.

САКРЭТ ФІРМЫ

## Шашлычок на беднасць

*Два рублі і сёння каштуе кілаграм мяса для студэнтаў Уфімскага нефцянога інстытута. Самае цікавае нават не тое — двухрублёвае мяса, сведчаць відавочцы, яшчэ і прыдатнае да яды.*

*Харчуюцца гэтым унікальным прадуктам, зразумела, толькі выбраныя таварышы. Льготы маюць студэнцкія [illegible] м'і, якія жывуць у [illegible] І яшчэ адна [illegible] бязна[illegible] мяса па дагав[illegible]цэнах, а студэнтам прадаюць па дзяржаўных, а не наадварот, як звычайна бывае. Розніцу ў цане, якая ў чатыры разы перавышае дзяржаўную, пакрывае за кошт сваіх прыбыткаў штаб працоўных спраў інстытута. Даходы штаба адпавядаюць назве і складаюцца ў асноўным са сродкаў, якія зарабілі студэнты ў будаўнічых атрадах і на сезонных работах, якімі таксама забяспечвае ШПС.*

## (Не) бясплатны бакалаўр

*Дзве ашаламляльныя навіны вырваліся на волю з-за дзвярэй рэктарскага кабінета і ў лічаныя імгненні абляцелі ўвесь Рыжскі універсітэт. Пачуўшы першую, усе ледзь ўтрымаліся на нагах ад нечаканай радасці: цяпер пасля заканчэння універсітэта яго выпускніку прысвойваецца не ганаровае званне «малады спецыяліст», а «бакалаўр» ці «магістр» (у залежнасці ад таго, чатырохгадовы ці шасцігадовы курс навучання заканчваеш).*

*Даведаўшыся пра другую, усе знямелі: навучанне ва універсітэце цяпер платнае! 1500 рублёў за семестр у «дзённікаў» — 750 — у вячэрнікаў і завочнікаў.*

*Дзякаваць, здаецца, трэба, толькі за што?*

## Сямёра дзяцей

*Сяргея Ізюмскага жывуць у ЗША. Даведаўся ён пра гэта ад Біла Харвурда і вельмі ўзрадаваўся. Жыццё студэнта Пермскага універсітэта рэзка змянілася — гэтым летам аж два месяцы ён правёў з амерыканскімі дзецьмі. Дзеля гэтага Сяргею прыйшлося вытрымаць вельмі сур'ёзны конкурс, пасля якога арганізацыя важатых ЗША прыняла рашэнне дапусціць Ізюмскага да дзяцей.*

## Стыпендыя Буша ў кішэні студэнта РДУ

*Сапраўдная падзея! Здаўшы сесію, студэнт другога курса мехмата аддзялення прыкладной матэматыкі РДУ увайшоў у спіс 398 выдатнікаў універсітэта штата Алабама, дзе цяпер вучыцца. Вадзім Хахлоў (выдатнік, але не з тых, хто асабліва вызначаецца) закончыў англійскую школу, што з'явілася суб'ектыўным станоўчым момантам яго амерыканскіх поспехаў. Аб'ектыўным — дзвюхступенчатая сістэма адукацыі ў ЗША. Магчыма, савецкі студэнт, з першага курса скіраваны выключна на вялікія здзяйсненні, проста не здольны адапціравацца да нудотна-размеранага тэмпу «загніваючага» буржуазнага навучання.*

НАШ АДКАЗ

## Герб і сцяг Рэспублікі Беларусь

Доктар гістарычных навук, прафесар А. П. ГРЫЦКЕВІЧ дае наступнае навукова-гістарычнае абгрунтаванне герба і сцяга Рэспублікі Беларусь:

— Герб Пагоня з'яўляецца старадаўнім гербам Беларуска-Літоўскай дзяржавы, канчаткова зацверджаным ў XVI стагоддзі. Аднак Пагоня мае яшчэ больш старажытнае беларускае паходжанне. Так, у жыццёпісе святога Меркурыя Смаленскага (XIII ст.) ёсць звесткі аб выяве народнага героя з мячом на белым кані на дзяржаўных пячатках крывіцкіх (беларускіх) Полацкага і Смаленскага княстваў у выглядзе святога Меркурыя, які бароніць крывіцкую зямлю ад ворага. Гэта выява находзіць у Полацкай зямлі яшчэ з дахрысціянскіх часоў і ўвасабляла тады постаць славянскага бога сонца Ярылы. Такім чынам, герб Пагоня з'яўляецца старадаўнім гербам Полацкага княства, гэтай першай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі.

Пагоня — сімвал усеагульнага апалчэння ўсіх мужчын для барацьбы з іншаземнымі захопнікамі за выгнанне іх са сваёй зямлі і пагоняй за імі ў іх зямлю, каб канчаткова разбіць іх. Пад час Грунвальдскай бітвы 1410 года, у якой былі разбіты нямецкія рыцары-крыжакі і спынена двухсотгадовая агрэсія на зямлі Беларусі і Літвы, сярод 40 харугваў войска Беларуска-Літоўскай дзяржавы 30 мелі на сваіх штандарах выяву Пагоні.

Пагоня заставалася дзяржаўным гербам Беларуска-Літоўскай дзяржавы да канца XVIII стагоддзя, калі Кацярына II далучыла Беларусь да Расійскай імперыі. Пасля гэтага Пагоня была ўключана ў Вялікі герб Расійскай імперыі — на грудзях у двухгаловага арла, побач з некаторымі іншымі далучанымі да Расійскай імперыі дзяржавамі, які існаваў да 1917 года.

У 1918 годзе Пагоня становіцца дзяржаўным гербам Беларускай народнай рэспублікі.

Бела-чырвона-белы сцяг быў вайсковым сцягам беларускіх воінаў у сярэднявеччы. У наступных стагоддзях усе конныя часткі войска Вялікага княства Літоўскага і Рускага ажно да канца XVIII стагоддзя мелі гэтыя баявыя сцяжкі. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі Кацярыны II у 80-х гадах XVIII стагоддзя сфармавала з беларускіх ураджэнцаў гусарскі полк і Полацкі мушкецёрскі полк. Вайсковымі адзнакамі для іх былі какарды з бела-чырвона-белымі колерамі.

Бела-чырвона-белы сцяг як беларускі нацыянальны быў прыняты беларускімі рэвалюцыйнымі студэнтамі ў Пецярбурзе ў канцы XIX стагоддзя. Гэты сцяг быў прыняты Усебеларускім з'ездам у Менску ў снежні 1917 года. Народны Сакратарыят Беларускай народнай Рэспублікі зацвердзіў яго ў жніўні 1918 года ў якасці дзяржаўнага сцяга Беларусі.

НАБАТ

# Лісты з Германіі

Клаус ШМІДТ — выпускнік філасофскага факультэта аднаго з савецкіх універсітэтаў. Пасля заканчэння ВНУ працаваў выкладчыкам марксісцка-ленінскай філасофіі ў Йене (Усходняя Германія). Пасля аб'яднання дзвюх дзяржаў сутыкнуўся з праблемамі, якія зведаюць цяпер і савецкія грамадазнаўцы. Прыводзім вытрымкі з яго лістоў. Спадзяёмся, што яны зацікавяць чытачоў нашай газеты.

**СЕННЯ<br>МОЙ ПОЗІРК<br>ЗУСІМ<br>ВЫПАДКОВА<br>ЗАТРЫМАЎСЯ<br>НА<br>ЦІКАВАЙ<br>АБ'ЯВЕ:<br>«ПРАДАЕЦЦА<br>ПОЎНЫ<br>ЗБОР ТВОРАЎ<br>У. І. ЛЕНІНА<br>ЦІ<br>МЯНЯЕЦЦА<br>НА<br>ТЭЛЕВІЗАР<br>«ГАРЫЗОНТ»...**

**ВЕЛЬМІ<br>ПАКАЗАЛЬНА<br>ДЛЯ<br>НАШАГА ЧАСУ.<br>КАЛІ<br>АДНАГО<br>СТОДА<br>ПАДСЦЕРАГАЕ<br>ЗА<br>ПАВАРОТАМ<br>ДРУГІ.**

**А ВАМ<br>НЕ<br>ЗДАЕЦЦА,<br>ШТО<br>СМЕТНІК<br>ГІСТОРЫІ<br>ЎЖО<br>ПЕРАПОЎНЕНЫ?**

**А ЯКІЯ<br>ЭМОЦЫІ<br>ВЫКЛІКАЮЦЬ<br>У ВАС<br>ПРАРОЧЫЯ<br>ПЕРАСЦЕРАГАЮЧЫЯ<br>СЛОВЫ<br>«ДОЛЯ НАША<br>МОЖА<br>СПАСЦІГНУЦЬ<br>І ВАС»?**

**ЗРЭШТЫ,<br>МЫ<br>ДАЎНО<br>ДА ЎСЯГО<br>АБЫЯКАВЫЯ<br>І<br>РАЎНАДУШНЫЯ...**

**...Усё мінулае і асабістае, усе ніці, якія кіруюць жыццём,— усё гэта разбурана. Новага нічога няма. І не ведаю — як, з якой мэтай жыць далей. Безадказна, так? Па дарозе думаў: якая ж тады радасць і адказнасць — мы і вакол чужы і варожы свет. Не хочацца так жыць. Быць можа, усе гэтыя думкі толькі вобразы адзіноты, недахоп кахання, калі не можаш, не хочаш свой твар паказаць іншаму чалавеку, а іншым гэта ўсё роўна.**

**У Йене адбываюцца страшэнныя рэчы. Калі ў Нардхаузене рост беспрацоўя зменшыўся (структура прамысловасці такая, што пераважаюць сярэднія прадпрыемствы і частка іх выжыве), то ў гэтым горадзе ўсяго толькі два прадпрыемствы і універсітэт. Да пачатку наступнага навучальнага года з універсітэта звальняюць дзве з шасці тысяч супрацоўнікаў (і я сярод іх), а з 35 тысяч рабочых, служачых і вучоных Карл-Цэйса — больш за 25 тысяч.**

**Атрымліваецца, што да 1991 года ў Йене палова працаздольнага насельніцтва будзе без работы. Гэта для горада, для функцыяніравання ўсіх камунальных і сацыяльных структур азначае крах, абвяшчэнне вайны.**

**...Я не ведаю, як выйсці з гэтага крызісу. Работу пакуль не знайшоў — паўсюдна адмовы. Увесь тыдзень я ў Йене. Учора быў апошні працоўны дзень. З 2 студзеня майго працоўнага месца ўжо не існуе. Ад былога заробку са студзеня атрымліваю толькі 70 працэнтаў. Рабіць мне няма чаго. І нават не хочацца: калі ад цябе ніхто нічога не патрабуе, ты і сам губляеш усялякую цікавасць. Гэта вельмі небяспечная сітуацыя. Мне трэба працаваць. Апетыту ўжо даўно няма. Хоць схуднею. Але страўнік пастаянна баліць. Дрэнна сплю і пакутую ад дэпрэсіі.**

**Дарэчы, звальненні выкладчыкаў грамадскіх навук — агульнаўсходнегерманская кампанія. Усе (хаця я не маю на дадзены момант дакладнай інфармацыі пра ўсіх) пакутуюць ад гэтай кампаніі. У Берліне, у Дрэздане, у Ростаку. Як быццам супраць нас пачалося раскулачванне. Зразумела, наш прафсаюз і нават рэктар Берлінскага універсітэта паскардзяцца на гэта рашэнне ўраду Зямель у суд і, пэўна, свайго дасягнуць: справа гэта супрацьзаконная і парушае канстытуцыю ФРГ. І гэта сапраўды вялікая перавага буржуазнай дэмакратыі: суд незалежны ад палітычнай і эканамічнай улады. Але нам гэта не дапаможа — свайго месца работы не атрымаем.**

**...Увесь гэты германскі свет такі халодны, раўнадушны. Усе табе ворагі і сапернікі. Змагацца табе трэба, каб не загінуць. Ну ты ж усё гэта ведаеш, усё гэта ветлівае раўнадушша, якое верціцца вакол грошай. Ды і Расія наўрад ці ўяўляе альтэрнатыву.**

**...Пакуль я сяджу ў вежы, адбылася сярэдняй рукі рэвалюцыя, мы абураліся тым, што без якой-небудзь згоды з нашага боку, без папярэджвання кіраўніцтва універсітэта вырашыла наша будучае. Ды што барацьба? Нас усіх выганяць. Мне здаецца, што прыйдзе вызваленне, калі я змагу пакінуць гэты дурдом.**

**...Ездзіў у Йену. У інстытуце нічога новага. Пытанне толькі ў тым, якім чынам нас будуць звальняць. Справа вельмі простая: у Заходняй Германіі існуюць пэўныя правы для дзяржаўных служачых. Але ўсе яны па дагавору аб аб'яднанні Германіі не дзейнічаюць для нас, ва Ўсходняй Германіі. Цудоўна, так?! У прынцыпе, універсітэты, якія знаходзяцца пад кантролем міністэрстваў культуры Зямель,— прыгонныя міністра без усялякіх сацыяльных правоў.**

**Работу, зразумела, пакуль не знайшоў. Рабіць няма чаго. Мне ўсё гэта надакучыла. Цяпер у мяне часта бываюць дэпрэсіі. Мне трэба працаваць з людзьмі. Адзінота забівае. І я зараз зразумеў глыбокую думку з працаў пратэстантаў: сабе дапамагаць можна, толькі дапамагаючы іншым. Самая чыстая дыялектыка жыцця.**



ПІНГ-ПОНГ

**Ці будзем мы і надалей святкаваць традыцыйныя савецкія Кастрычнік і Першамай?**

**І. САКАЛОЎ,**
**студэнт.**

## Бывай, Першамай?

ЧАГО не ведаем, пра тое сказаць не можам. Бо да 15 кастрычніка, калі адбудзецца сёмая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, нават народных дэпутатаў такое пытанне паставіць у тупік. Зрэшты, Апазіцыяй БНФ падрыхтаваны праект пастановы «Аб дзяржаўных святах Рэспублікі Беларусь», дзе прапаноўваецца, грунтуючыся на Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь», рашэннях нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі (24—25 жніўня 1991 года), з мэтай захавання нацыянальных традыцый народа адмяніць афіцыйныя дзяржаўныя святы Саюза ССР — 7 кастрычніка, 7—8 лістапада, 1—2 мая і лічыць гэтыя дні працоўнымі, абвясціць дзяржаўнымі святамі Рэспублікі Беларусь і выхаднымі днямі 25—26 снежня, 7—8 студзеня (Нараджэнне Хрыстовае), 25 сакавіка (Дзень Незалежнасці), а таксама лічыць выхадным другі дзень Вялікадня ў каталіцкай і праваслаўнай традыцыі.

Так што, магчыма, на змену старым святам прыйдуць новыя з тых, што афіцыйна не святкаваліся.

РЭКВІЕМ

# ЦІ БАЧЫЛІ ВЫ МЁРТВЫ ТВАР ЗОІ?

**Нам прапанавана развітацца з чарговым ідэалам. Ці не апошнім?..**

**«Аргументы и факты» паведамілі новыя звесткі аб гібелі Зоі Касмадзем'янскай. Згодна з імі, яна была падпальшчыкам сялянскіх хат, а не нямецкіх канюшняў. Паспела спаліць толькі адну хату — калі падпальвала другую, яе схапілі мясцовыя жыхары. Збілі і прывялі да свайго старасты. А той перадаў у рукі фашыстаў, якія былі на пастоі не ў Пятрышчаве, а ў суседняй вёсцы, калі верыць аўтару артыкула ў «АиФ».**

Верыць ці не? Магчыма, усё гэта — праўда. Магчыма, не была Зоя гераіняй у тым сэнсе, у якім мы так доўга лічылі яе такой. Значыць, нас зноў ашукалі ў нашых лепшых пачуццях. І боль ад такіх падманаў становіцца звыклым, хоць усё роўна не праходзіць. У што мы яшчэ верым? Адна легенда за другой разбіваюцца — даваенныя героі працы, героі Вялікай Айчыннай. Неяк проста гэта атрымалася, бо мы не супраціўляліся асабліва: хутка прызналі рэкорды Стаханава «папяровымі», лёгка паверылі ў тое, што Матросаў быў не першым, хто захіліў целам амбразуру, і ў тое, што ў германскай арміі таксама былі такія героі. Мы не баімся працягваць гэты шэраг і не бяромся адстойваць гонар ніводнага з былых куміраў. Яны нам больш не патрэбны!

А засталіся нам меркантыльныя турботы вакол недасканалага быту, злосць на лёс, якая ўсё расце, і страшэнная стомленасць ад жыцця, такога жорсткага і несправядлівага. Што яшчэ можа быць у ім святога, ідэальнага, проста станоўчага? Хіба толькі тое, на што мы час ад часу кідаем свае зайздросныя позіркі ў заходнім напрамку. Тым людзям жывецца цудоўна, думаем мы,— у іх лепшы лад жыцця, і ўсё там лепшае...

Відавочна, мы знайшлі сабе новых куміраў — жывых у выглядзе добра забяспечаных матэрыяльна людзей і неадушаўлёных у выглядзе ўмоў іх існавання. Мы не можам пражыць без герояў наогул. Чалавечая сутнасць у няспынным імкненні да ідэалу. Нашы дзеці і падлеткі адмаўляюцца жыць без яго. Гэта даўно ўжо не Паўлік Марозаў і не Зіна Партнова. Іх месца заняў Віктар Цой, не навязаны ў якасці героя дарослымі дзядзькамі...

А што ж рабіць нам, не дзецям? Гавораць, чалавек толькі тады застаецца асобай, калі ён здольны захоўваць у сабе хоць рэшткі дзяцінасці. І дзе ж яны? Казкі не чытаем, песні не спяваем, шчыра не рагочам. Але зрэдку так моцна пакутуем ад таго, што ўжо не можам быць дзецьмі. Не можам без аглядкі верыць ва ўсёмагутнасць Дабра, Чысціні і Прыгажосці.

Мы ўсё роўна, няхай і незаўважна для саміх сябе, будзем шукаць вакол ідэал. Але цяпер, адмовіўшыся ад значнай часткі таго, чым жылі ў нашым заідэалагізаваным дзяцінстве, мы міжволі знойдзем ідэалы фальшывыя.

А калі паспрабуем захаваць як сапраўдны Зою Касмадзем'янскую? Пасля мноства зняважаных герояў зрабіць гэта амаль немагчыма. Але, пазбавіўшы яе вобраз абражлівых усмешачак і з'едлівых рэплік, мы, магчыма, пачнем вучыцца адрозніваць сапраўднае ад фетышу.

Ці бачылі вы мёртвы твар Зоі? Фотаздымкі, якія адлюстравалі яе смерць, застаюцца адзінымі з нямногіх сапраўдных сведак тых падзей. Сістэма, якая столькі разоў падманвала нас, у тым ліку і Зою, магла прымусіць яе ваяваць у партызанскім атрадзе згодна з тэорыяй «выпаленай зямлі», знішчаючы ўсё, што трапіла б у рукі фашыстаў пасля іх перамогі; тая ж сістэма магла навучыць сказонай праўдзе журналіста «Праўды» Пятра Лідава, які першы напісаў пра Зою. Але падрабіць здымкі сістэма не магла. Яны назаўсёды застануцца доказам пакут васемнаццацігадовай дзяўчыны.

Жудасная смерць была сапраўднай, ніхто і ніштто не здолее абвергнуць гэты факт, і яна будзе выглядаць яшчэ больш жудаснай, калі канчаткова высветліцца, што дапамаглі Зоі памерці яе суайчыннікі. Цела было закатаванае, гэта засведчыла маці, Любоў Цімафееўна Касмадзем'янская. Калі яна прыехала ў Пятрышчава, труну дасталі з зямлі і адкрылі...

Потым маці напісала кнігу. Мы ўсе чыталі яе, калі былі піянерамі,— «Аповесць аб Зоі і Шуры». І шчыра захапляліся многімі падрабязнасцямі з жыцця сям'і Касмадзем'янскіх, якія данесла нам Любоў Цімафееўна. Перш за ўсё мы, зразумела, захапляліся рысамі характару яе дачкі і пісалі ў дзіцячых анкетах, што Зоя Касмадзем'янская — наш ідэал. Няўжо сёння ад таго захаплення не засталося нічога?

Не, павінна было захавацца адчуванне чысціні, сур'ёзнасці і сумленнасці, якімі прасякнуты ўсе думкі і ўчынкі дзяўчынкі з імем Зоя. Між тым, наша рэчаіснасць не ў стане захаваць такія рысы сённяшнім хлопчыкам і дзяўчынкам. Магчыма, у тым ліку і таму, што не засталося ў іх такога куміра, як Зоя Касмадзем'янская.

Мабыць, мы зразумеем гэта і кінемся шукаць вакол характары накшталт таго, які быў у яе. Але гэта адбудзецца значна пазней. Тады мы, напэўна, усвядомім, што Зоя Касмадзем'янская была сапраўды прыгожай асобай, значна вышэйшай за большасць з нас. Да таго, ж, яна загінула. А мы так любім ушаноўваць мёртвых, а не жывых!

**В. БЯГУН.**

## МЕНЮ

Хоць раз за дзень, за тыдзень, за месяц... падумайце пра сваё здароўе, чытаючы гэтую паласу. Вы ж так рэдка ўзнагароджваеце яго ўвагай — да тых часоў, пакуль здароўе не пачынае настойліва абвяшчаць сваё існаванне. Спадзяёмся дапамагчы вам папярэдзіць неспрыяльныя сігналы з яго боку і падрыхтавацца да іх, пры гэтым, зразумела, жадаем ніколі не пачуць і не падумаць пра сябе: «Хворы...»

Ці ёсць яшчэ такія сярод нас? Пэўна, рэдкія-рэдкія адзінкі. Таму матэрыялы данай старонкі прызначаны перш за ўсё астатнім, амаль усім. Жадаем вам заўсёды мець выбар. І заўсёды рабіць яго на карысць здароваму ладу жыцця, лекам, здабытым у прыроды і старажытных продкаў, добраму настрою, зносінам з цікавымі людзьмі і ўсяму, што не ўстане замяніць нават самыя дасканалыя ўрачэбныя сродкі.

СЛУЖБА 03

# Каму патрэбна флюараграфія?

Чым раней выяўлена тое ці іншае захворванне, тым лягчэй і хутчэй можна яго вылечыць. На жаль, многія захворванні органаў грудной клеткі, такія як туберкулёз і пухліны лёгкіх, іншыя захворванні доўгі час працякаюць бессімптомна, і чалавек не спяшаецца за медыцынскай дапамогай.



Адзіным спосабам выяўлення гэтых хвароб з'яўляюцца масавыя рэнтгеналагічныя агляды насельніцтва — флюараграфія. У нашай краіне хварэюць на туберкулёз больш за паўмільёна чалавек. Штогод выяўляецца яшчэ да 150 тысяч хворых з устаноўленым упершыню ў жыцці дыягназам актыўнага туберкулёзу. Смяротнасць ад гэтай хваробы вышэйшая, чым ад усіх іншых інфекцыйных захворванняў разам узятых.

У апошнія гады адзначаецца тэндэнцыя да росту захворванняў. Сёння ж у арганізм чалавека разам з ежай, вадой, паветрам пранікаюць розныя хімічныя рэчывы, часам вельмі ядавітыя, што прыводзіць да зніжэння імунітэту.

Часцей за ўсіх хварэюць на туберкулёз людзі, якія апусціліся, сацыяльна-дэфармаваныя: больш паловы хворых туберкулёзам у краіне — алкаголікі, бомжы і бомзы.

Не менш дрэнныя справы і з пухлінамі лёгкіх, захворванне якімі расце з кожным годам. Вельмі важна выявіць раннія формы рака, бо аператыўнае лячэнне такіх хворых дазваляе ў 80 працэнтах выпадкаў прадоўжыць жыццё больш чым на 5 гадоў. Трэба ведаць: пухліна павялічваецца на працягу года больш чым у два разы.

Надзейнай «вартай», якая забяспечвае стопрацэнтнае выяўленне такіх вераломных хвароб, як туберкулёз і рак лёгкіх, можа стаць флюараграфія.

У Беларусі ў сувязі з неспрыяльнай радыяцыйнай абстаноўкай з 1990 года праводзіцца выбарачнае флюараграфічнае абследаванне насельніцтва 1 раз у 2 гады. Аднак шматгадовыя назіранні паказалі, што асобы з рэшткавымі змяненнямі ў лёгкіх пасля перанесеных захворванняў, якія хварэюць на цукровы дыябет, язвавую хваробу страўніка і дванаццаціперснай кішкі, пакутуюць ад алкагалізму і наркаманіі, якія працуюць ва ўмовах вытворчай шкоднасці, курцы, а таксама мужчыны старэйшыя за 45 гадоў і жанчыны старэйшыя за 50 гадоў найбольш рызыкуюць захварэць туберкулёзам, пухлінай лёгкіх. Яны маюць патрэбу ў штогадовым флюараграфічным абследаванні.

Неабгрунтаваныя абвінавачванні ў адрас флюараграфіі, якія з'явіліся ў прэсе, спасылкі на вопыт абследавання ў некаторых краінах Захаду без уліку рэальнай абстаноўкі па туберкулёзу і анказахворваннях у рэспубліцы вядуць да нематываваных адмаўленняў ад абследавання, што можа прывесці да цяжкіх вынікаў. Ёсць апісанне назірання на працягу 40 гадоў над 100 тысячамі настаўнікаў, якія два разы на год прахадзілі флюараграфію, і толькі ў 2 чалавек быў выяўлены рак лёгкага, што значна ніжэй за сярэднія лічбы. Гэта абвяргае выказванні, што флюарграфічныя агляды, якія праводзяцца штогод, прыводзяць да росту анказахворванняў.

Доза іанізуючага выпраменьвання пры флюараграфіі не перавышае сярэдняй дозы ад натуральнага фону, паглынутай на працягу года ці атрыманай за дзень загару. Даказана, што карысць ад выяўлення рака лёгкага ў 20 разоў вышэй за рызыку ад апрамянення пры флюараграфіі.

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
урач.

ДОКТАР

ГЭТА НЕ

ПРАПІША

Амерыканская асацыяцыя ўрачоў падлічыла, што шкода ад лекавых ускладненняў, якія напаткалі амерыканцаў за апошнія дзесяцігоддзі, большая, чым ад усіх інфекцыйных захворванняў, разам узятых. Лепш пазбягаць лекаў наогул — ёсць жа больш карысныя і эфектыўныя метады пазбаўлення ад болю і хвароб. Многія з іх змяшчае рускі народны лячэбнік П. КУРАНОВА.

СРОДКІ АД ЗУБНОГА БОЛЮ. Заварыць шалфей і цёплым наварам паласкаць хворае месца ў роце, старацца пры гэтым як мага больш часу трымаць навар на балявым участку. Калі навар астывае, яго трэба мяняць. Рабіць гэта даводзіцца часта: ад трох да пяці разоў на працягу паўгадзіны ці чвэрці гадзіны, пасля чаго боль сціхае.

## Вой, ба-лі-ць!

Другі спосаб — з дапамогай сала. Кавалачак яго (свежага ці салёнага — тады соль абчысціць) кладзецца на хворае месца, паміж дзяснаой і шчакой. Трымаць кавалачак у роце 15—20 хвілін, пакуль боль не сціхне.

Можна выкарыстаць пры зубным болі і карэньчык трыпутніку. Яго трэба пакласці ў вуха з таго боку, дзе баліць зуб, і трымаць там да знікнення болю. Звычайна гэта адбываецца праз паўгадзіны-гадзіну.

І апошні, самы арыгінальны спосаб, які выкарыстоўваюць жыхары некалькіх сібірскіх вёсак. Зубны боль яны лечаць з дапамогай часнаку. Ім націраюць запясце рукі з унутранага боку. Далей, дробна нарэзаўшы часнок, прывязваюць яго да пульсу вельмі шчыльна. Руку трэба спачатку закрыць анучай.

СРОДАК АД НАСМАРКУ. Перш за ўсё трэба памятаць, што насмарк — праява інфекцыйнага захворвання, таму пры лячэнні яго тым ці іншым спосабам трэба карыстацца толькі чыстай насоўкай, каб потым яна не стала крыніцай чарговай немачы.

Першы спосаб — удыханне табакі як мага глыбей, каб яна праз насаголотку праходзіла ў рот. Пасля некалькіх порцый тытуню насмарк знікае.

Добра дапамагае ад насмарку і прамыўка чыстай вадой хатняй тэмпературы. Ваду ўліць у жменю і ўцягваць па чарзе адной і другой ноздрай, каб вада праходзіла ў рот.

# НЯЗВЫКЛА, АЛЕ РАЦЫЯНАЛЬНА

*Мода на харчаванне — што мода на адзенне: многім хацелася б прытрымлівацца яе канонаў, але не ўсе на гэта здатныя. Старыя звычкі і стэрэатыпы не дазваляюць усім жадаючым хутка і лёгка стаць прыхільнікамі тэорый Х. Шэлтана (так званае паасобнае харчаванне) ці Г. Шаталавай і А. Чупруна (вегетарыянства). Галоўнай перашкодай, як правіла, становіцца з'ява пад назвай псіхалогія густу.*

*Калі ж вы не супраць адмовіцца ад звыклых кампанентаў на сваім стале, пачынайце паступова змяняць састаў ежы. Новыя рэцэпты страў спачатку пададуцца вам экзатычнымі, але потым вы, магчыма, назаўсёды адмовіцеся ад старых звычак на карысць свайму здароўю.*

*Паспрабуйце пачаць з тых рэцэптаў, якія прапануе дырэктар Цэнтра здаровага харчавання Маскоўскага інтытута народнай гаспадаркі імя Г. Пляханава, кандыдат тэхнічных навук, вучоны-наватар У. С. МІХАЙЛАЎ.*



МЯСНАЯ СТРАВА. Парэжце мяса невялікімі кавалкамі, палажыцые на тонкі слой гародніны на сухой патэльні. Зверху мяса трэба пасыпаць сырой рубленай цыбуляй. Налейце гарачай салёнай вады, каб днішча патэльні было пакрыта, і пастаўце яе ў гарачую духоўку на 8—10 хвілін. Затым патэльню трэба дастаць, усё размяшаць і, накрыўшы накрыўкай, яшчэ 5—7 хвілін патрымаць у духоўцы. І адразу ж падаваць на стол, дадаўшы да мяса гародніну, травы, карэнні, маянэз, смятану.

Цяпер аб катлетах. У нашай краіне яны папулярныя, за мяжой — вялікая рэдкасць. Традыцыйна лічыцца, што для павышэння сакавітасці, мяккасці вырабаў з рубленага мяса да яго дадаюць хлеб. Але ж ужо пры выпечцы крухмал крышталізуецца і таму ў катлетнай масе не можа затрымлівацца сок. Паспрабуем зрабіць інакш.

КАТЛЕТЫ. Прапусціце праз мясарубку мяса разам з сырой гародінай (напалову). Падыйдзе морква, капуста, гарбуз, кабачкі, цыбуля. Затым дадайце ў масу сырую манную крупу (на 1 сталовую лыжку масы 1 чайная лыжка крупы), соль, спецыі, пранасці, сухія травы. Фарш добра перамяшайце і паступова ўлівайце ваду ці малако, пакуль маса не будзе эластычнай, аднароднай, з кансістэнцыяй смятаны сярэдняй гушчыні.

Гародніна надасць катлетам добры смак, знізіць каларыйнасць і павысіць усваяльнасць. Як смажыць катлеты? Аптымальны спосаб — на гароднінай «падушцы». На кавалачкі нераэзанай гародніны накладвайце маленькія катлеты і, падліўшы нямнога вады, выпякайце 10—15 хвілін.

МАЛОЧНУЮ КАШУ пачнем гатаваць... з гародніны. У каструлю пакладзіце бурак, морвку, капусту, гарбуз, кабачкі, агуркі, рэпку, радыс, парэзаўшы як захочацца. Гародніна павінна цалкам закрыць днішча. На яе — слой прамытых круп: рыса, проса, пярловых ці кукурузных. Ён павінен быць большы за гароднінны. Зверху — зноў гародніна. І так некалькі разоў. Толькі памятайце: зверху і знізу — гародніна. Цяпер у каструлю асцярожна, не размываючы слаі, улівайце гарачую ваду, каб яна цалкам пакрыла прадукты. Крупы з гароднінай, не перамешваючы, хутка давядзіце да кіпення так, каб вада ў цэнтры забурліла. Затым здыміце посуд з агню і працягвайце настойваць без награвання 20—40 хвілін у залежнасці ад выбраных круп. Незвычайны спосаб, ці не праўда? Але ён дапаможа рацыянальна выкарыстоўваць і гародніну, і крупы. А малако можна дабаўляць у гатовую кашу.

МАРОЖАНАЕ ПЛАМБІР. Звычайна, з'ядаючы пахучую, таючую ў роце порцыю, мы, натуральна, не задумваемся, што незаўважна ўводзім у арганізм 30 грамаў тлушчу і цукру. Адзначым, што ядзім мы марожанае на дэсерт, калі страўнік ужо перапоўнены. Дык што, адмовіцца? Ні ў якім разе! Падавайце марожанае з садавіна-гароднннымі напаўняльнікамі. Разрэжце пламбір так, каб атрымалася з порцыі 3—4 кавалачкі. На дно талеркі пакладзіце моркву, бурак, яблыкі, а зверху накрыйце марожаным. Салодкая маса, растаяўшы, напоўніць гародніну і яблык. Паспрабуйце — не пашкадуеце.

ТАКІМ ЧЫНАМ, НОВЫЯ СТРАВЫ Ў ВАШЫМ МЕНЮ. СМАЧНА ЕСЦІ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

10 кастрычніка
Зак. 2074.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.